# ЗЯРНЯТКА 4

1 кастрычніка 2017 г. XXVI Звычайная нядзеля, Год А

*Мытнікі і распусніцы наперадзе вас ідуць у Валадарства Божае* *Мц 21, 28-32*

Езус сказаў першасвятарам і старэйшынам народу: Як вам здаецца? У аднаго чалавека былі два сыны. Прыйшоўшы да першага, ён сказаў: Сыне, ідзі і працуй сёння ў вінаградніку. Але той адказаў: Не хачу! А пасля, апамятаўшыся, пайшоў. Тады ён падышоў да другога і сказаў тое самае. Той жа сказаў у адказ: Ужо іду, спадару. І не пайшоў. Каторы з двух выканаў волю бацькі? Кажуць Яму: Першы.

Тады Езус кажа ім: Сапраўды кажу вам, што мытнікі і распусніцы наперадзе вас ідуць у Валадарства Божае. Бо прыйшоў да вас Ян шляхам справядлівасці, і вы не паверылі яму. А мытнікі і распусніцы паверылі яму. Вы ж, убачыўшы, не апамяталіся пасля, каб паверыць яму.

*Гэта слова Пана.*



**Узгадай пра міласэрнасць сваю, Пане.**

# Разгадай Крыжаванку.






**Па гарызанталі:**

1. Месца, дзе ёсць Бог, Марыя, анёлы і ўсе святыя.
2. Як сын у сённяшняй прыпавесці звярнуўся да свайго айца?
3. Як Езус называе грэшніка?
7. Трэба ў сваім жыцці спаўняць …..Божую.
8. Член сям'і.

**Па вертыкалі:**

1. Месца працы абодвух сыноў.
2. Сын Божы.
5. Чаго бацька патрабуе ад сваіх сыноў?
6. Адрасаты сённяшняй прыпавесці.
7. Яе Бог патрабуе ад кожнага чалавека.

А ты заўсёды даводзіш справу да канца? Асабліва калі старэйшыя просяць цябе аб нечым важным, ці ты не забываешся дапамагаць сваім бацькам, асабліва калі яны цябе папрасілі?
Памаліся сёння за сваю сям'ю, за сваіх бацькоў. Памаліся за сябе, каб быць паслухмяным Богу і сваім бацькам і быць верным свайму слову, заўсёды выконваць свае абавязкі.

